# ПЕРАДУМОВЫ СТВАРЭННЯ МУЗЕЯ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА

***Ю. В. Кавалёва,*** *аспірант*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў,*
*загадчык аддзела экспазіцыйна-выставачнай работы*
*Музея гісторыі горада Мінска*

Музеі гісторыі гарадоў прынята вылучаць у асобную групу. Яны пачалі ўзнікаць у Еўропе ў сярэдзіне XIX ст. Найстарэйшым лічыцца Музей Карнавале ў Парыжы, створаны ў 1866 г. Музеі, прысвечаныя гарадам, якія з'яўляліся пазней, бралі за аснову мадэль музея Карнавале. Пашырэнне такіх устаноў адбывалася ў XX ст. Аналіз культуралагічных фактараў і гістарычных абставін іх узнікнення паказвае, што каталізатарам гэтага працэсу – сярод іншых – стала ўрбанізацыя. На музеі гарадоў была ўскладзена задача захавання гісторыка-культурнай спадчыны горада, над якой навісла пагроза знішчэння ў сувязі з імклівымі зменамі і ростам мегаполісаў.

Другім важным фактарам стварэння музеяў гарадоў у пачатку XX ст. з'яўляецца станаўленне новых дзяржаў і афармленне сталічнага статусу гарадоў Усходняй і Цэнтральнай Еўропы. Найпершай задачай музеяў стала фарміраванне ідэнтычнасці, разумення прыналежнасці да ўрбаністычнай супольнасці ў межах агульнанацыянальнага кантэксту.

Пытанні ўзнікнення музеяў гарадоў разглядаюцца ў спецыяльным нумары часопіса «Museum» 1994 г. [3]. Тая ж тэма раскрываецца ў артыкуле Жана-Луіса Пастулы (Jean-Louis Postula) [6].

Музеі гісторыі гарадоў Беларусі ствараліся ў агульнаеўрапейскім кантэксце і яскрава дэманструюць асаблівасці гістарычнага шляху развіцця краіны. Музей гісторыі горада Мінска – самы малады з пяці дзейных падобнага кшталту. Ён створаны рашэннем Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта ад 8 красавіка 2010 г. № 815 [2, с. 11–14]. Невялікі экскурс у гісторыю і перадумовы ўзнікнення музея.

Аналіз вопыту стварэння еўрапейскіх музеяў гарадоў дазваляе вылучыць тры шляхі іх станаўлення. Першы – праз ператварэнне прыватнай калекцыі ў публічны музей – дар гораду ад удзячных мецэнатаў і калекцыянераў. Другі шлях – навукова-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асветная і краязнаўчая дзейнасць грамадскіх устаноў, якія маглі займацца збіральніцкай працай. Трэці шлях – ініцыятыва з боку гарадскіх уладаў або органаў мясцовага самакіравання. У Мінскуназіраліся ўсе названыя перспектывы дзеля стварэння гарадскога музея.

Традыцыі музейнай справы ў горадзе і ваколіцах пачынаюць фарміравацца з сярэдзіны XIX ст. Гэта праявілася ў развіцці прыватнага збіральніцтва. Цікавай калекцыяй валодаў адзін з заснавальнікаў беларускай археалагічнай навукі К. П. Тышкевіч. Буйны гісторыка-археалагічны збор быў створаны дзякуючы намаганням мінскага калекцыянера Г. Х. Татура. На аснове сваёй калекцыі ў 1888 г. ён арганізаваў у Мінску археалагічную выставу. Заўзятым збіральнікам быў і мінскі чыноўнік М. А. Гаўсман. Калекцыя сакратара Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу Ю. Кабылінскага ператварылася ў прыватны музей.

Аднак названыя багатыя зборы, на жаль, не сталі асновай гарадскога музея. К. П. Тышкевіч ахвяраваў калекцыі Віленскаму музею старажытнасцяў. Г. Х. Татур не меў нашчадкаў, і ўвесь яго збор быў распрададзены, а прадметы трапілі пераважна ў музеі Вільні і Львова. Экспанаты Ю. Кабылінскага апынуліся ў Віленскім музеі старажытнасцяў [1, с. 38–39].

З другой паловы XIX ст. месцамі збору і апрацоўкі матэрыялаў па гісторыі і прыродзе краю сталі губернскія статыстычныя камітэты, якія выконвалі адміністрацыйныя і навуковыя функцыі. Вынікам дзейнасці Мінскага камітэта стала стварэнне калекцыі, якая збіралася для мясцовага музея лясной гаспадаркі [1, с. 87].

У канцы XIX ст. пачалі фарміравацца зборы царкоўных старажытнасцяў. У 1908 г. узнік музей Мінскага царкоўна-археалагічнага камітэта. Ініцыятарамі выступілі прадстаўнікі гарадской інтэлігенцыі – А. К. Снітка, Д. В. Скрынчанка, Н. Н. Былоў, А. П. Смародскі, А. Д. Юрашкевіч. Пад рэдакцыяй А. К. Сніткі быў выдадзены каталог найбольш каштоўных калекцый музея – рукапісаў і стардрукаў. Зборы ўстановы леглі ў аснову Беларускага дзяржаўнага музея [1, с. 93].

Намаганні па стварэнні музея горада назіраліся і з боку гарадскіх уладаў. Спроба яго арганізацыі была ініцыявана ў пачатку XX ст. У 1909 г. да гэтага заклікалі галосны Мінскай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гарадской Думы В. О. Янчэўскі і інжынер М. Н. Кузняцоў. Значную ролю ў дадзеным працэсе адыграла Мінскае таварыства аматараў прыродазнаўства, этнаграфіі і археалогіі.

У 1912 г. быў выпрацаваны і зацверджаны статут Мінскага гарадскога музея, а гарадская Дума вылучыла спецыяльнае памяшканне і асігнавала 2 тыс. рублёў. Добраахвотныя ахвяраванні паскорылі адкрыццё музея, які ў 1913 г. зладзіў выставу першых набыткаў. У адпаведнасці са статутам установу ўзначальваў савет з пяці чалавек, траіх выбірала гарадская Дума, а двух прызначала таварыства. У структуры музея меліся гістарычны, археалагічны, этнаграфічны, прыродазнаўчы і мастацка-прамысловы аддзелы [5, с. 2]. Дэманстраваліся ўзоры глебы, мінералы, пудзілы звяроў і птушак, экзэмпляры выкапнёвых жывёл, старажытныя прылады працы, нумізматыка і іншыя калекцыі. У 1916 г. на базе музея адкрылася выстаўка жывапісу і дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва. У выстаўцы браў удзел і Мінскі аддзел нагляду за прадметамі мастацтва і культуры, які прэзентаваў каля 250 экспанатаў, у тым ліку карціны П. Брэйгеля, Б. Мурыльё, Я. Рустэма, Я. Дамеля.

Рэвалюцыйныя падзеі 1917 г. спынілі працу па стварэнні экспазіцыі Мінскага гарадскога музея. Неўзабаве ён быў зачынены. У 1920 г. калекцыі перадалі ў Мінскі абласны музей.

Такім чынам, перыяд актыўнага фарміравання музеяў гарадоў Еўропы ў другой палове XIX – пачатку XX ст. на беларускіх землях быў адзначаны шматлікімі намаганнямі. Аднак гістарычныя абставіны, звязаныя з адсутнасцю дзяржаўнасці, Першай сусветнай вайной, рэвалюцыйнымі падзеямі 1917 г. і Грамадзянскай вайной не дазволілі завяршыць распачатую справу па стварэнні Мінскага гарадскога музея. Пазней развіццё музейнай справы адбывалася праз фарміраванне дзяржаўных музеяў, большасць з іх мела краязнаўчы профіль.

Ідэя стварэння музея горада Мінска паўставала не адзін раз і была заканамерным вынікам тых палітычных, культурных і сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў, якія адбыліся ў беларускім грамадстве ў апошнія дзесяцігоддзі XX ст. Сярод іх галоўныя – утварэнне незалежнай дзяржавы і працэс самавызначэння горада Мінска як сталіцы.

У 1980-я гг. існавала некалькі праектаў музея горада Мінска. Паводле аднаго з іх яго стварэнне планавалася ў гістарычным будынку на тэрыторыі Траецкага прадмесця. Эскізныя малюнкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

экспазіцыі дазваляюць казаць, што ў аснову быў пакладзены храналагічны прынцып, меркавалася пабудова вялікага макета горада.

Іншы праект прадугледжваў комплексную рэгенерацыю гістарычнай забудовы цэнтра Мінска. Прапановы па рэстаўрацыі і прыстасаванні 1982 г. (галоўны архітэктар С. Г. Багласаў) уключалі цэлы шэраг музеяў. Сярод іх – Музей гісторыі горада ў будынку Дома прафсаюзаў, археалагічны музей-запаведнік «Мінскае замчышча».

У 1990–1991 гг. выканкам Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў зацвердзіў палажэнне аб гісторыка-культурнай запаведнай тэрыторыі «Мінскае замчышча». У мэтах захавання гэтай унікальнай тэрыторыі і яе музеефікацыі планавалася стварэнне гісторыка-археалагічнага комплексу «Мінскае замчышча» з перспектывай размяшчэння ў будынку «Працоўныя рэзервы» музея гісторыі горада Мінска. Аднак раскоп замчышча быў закансерваваны метадам засыпкі.

Тэрыторыя Мінскага замчышча ўпершыню разглядалася як аб’ект музеефікацыі ў 1960-я гг. Да 900-годдзя горада Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў прыняў план будаўніцтва гістарычнага музея на месцы комплексу «Працоўныя рэзервы». Побач з ім планавалася адкрыць для агляду аб’екты раскопак пад шкляным купалам (аўтар праекта – архітэктар О. Ф. Ткачук, 1966 г.). Аднак у плане генеральнай забудовы паркавай магістралі 1972 г. нічога канкрэтнага пра музей не адзначана [4, с. 79–80].

Чарговы этап у гісторыі музея горада Мінска пачаўся ўжо ў новым XXI ст. У 2003 г. пры ўпраўленні культуры Мінгарвыканкама пачала працаваць рабочая група па стварэнні музея. Яна распрацавала праект навуковай канцэпцыі і структуры ўстановы. У 2010 г. была адкрыта першая экспазіцыя ў будынку XIX ст. на тэрыторыі Верхняга горада па вул. Рэвалюцыйнай, 10.

У той жа час зноў звярнуліся да ідэі музеефікацыі Мінскага замчышча. У 2010 г. быў узгоднены архітэктурны праект гісторыка-культурнага комплексу «Нацыянальны гісторыка-археалагічны цэнтр “Мінскае замчышча”» (УП «Мінскпраект», архітэктары С. Г. Багласаў, В. Д. Нікіцін). Мінгарвыканкам зацвердзіў праграму адраджэння гэтай гістарычнай часткі, а сам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аб’ект уключылі ў інвестыцыйную праграму Мінска на 2013 г. Комплекс планавалася размясціць уздоўж берага Свіслачы ад станцыі метро «Няміга» да фантана перад Палацам спорту. Ён уключаў тры часткі: падземны музей, наземны макет фрагмента горада XII ст. і забаўляльную зону на Ніжнім рынку. Паводле праекта будынак «Працоўныя рэзервы» падлягаў разбурэнню. У музеі меркавалася паказаць выяўленыя археалагічныя знаходкі ў выглядзе археалагічнага раскопа, а над ім пабудаваць залу-амфітэатр і абхадныя галерэі. Замчышча планавалася злучыць з Траецкім прадмесцем пешаходным мастом. Аднак будаўнічыя работы так і не пачаліся, а ў 2016 г. прынята рашэнне лічыць музеефікацыю замчышча немэтазгоднай. Галоўная прычына палягала ў высокім кошце праекта і нізкай інвестыцыйнай прывабнасці.

Тым не менш Музей гісторыі горада Мінска працягвае развівацца. Шлях яго станаўлення можна параўнаць з аналагічнымі ўстановамі Масквы, Санкт-Пецярбурга, Варшавы, Белграда. Агульнае ў іх – комплексны падыход да інтэрпрэтацыі гарадской гісторыі праз стварэнне тэматычных экспазіцый і музеефікацыю гістарычных гарадскіх будынкаў і прылеглых тэрыторый. На сённяшні дзень (2021) у структуры музея функцыянуюць дзевяць аб’ектаў: філіялы «Гарадская мастацкая галерэя твораў Л. Д. Шчамялёва» і «Музей “Лошыцкая сядзіба”», структурныя падраздзяленні: Мастацкая галерэя Міхаіла Савіцкага, Майстэрня-музей Івана Міско, Арт-гасцёўня «Высокае места», Мінская гарадская ратуша, экспазіцыі: «Карэтная», «Мінская конная чыгунка», «Мінск. Верхні горад. Археалагічны музей». У планах – стварэнне экспазіцыі па гісторыі Мінска савецкага перыяду «Вобразы савецкага Мінска 1919–1991».

Такім чынам, доўгі працэс станаўлення Музея гісторыі горада Мінска адлюстроўвае тыя сацыякультурныя і грамадска-палітычныя падзеі, якія адбываліся ў Беларусі. Найбольш актыўныя намаганні ў дадзеным напрамку назіраліся ў перыяд уздыму цікавасці да нацыянальнай культуры ў другой палове XIX – першай чвэрці XX ст., а таксама звязаныя з тэрытарыяльным і індустрыяльным ростам горада. Аднак поспех у рэалізацыі праекта быў дасягнуты толькі ў пачатку XXI ст.,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

калі Мінск замацаваў за сабой трывалы статус сталіцы незалежнай дзяржавы.


1. *Гужалоўскі, А. А.* Нараджэнне беларускага музея / А. А. Гужалоўскі – Мінск : НАРБ, 2001. – 124 с.

2. *Ладисова, Г. П.* Музей, который ждали... / Г. П. Ладисова // Белая Русь : рекламный торгово-промышленный журн. Респ. Беларусь / учред.: Виктор Корнейчик. – 2012. – № 2/3. – С. 11–14.

3. Музеум : междунар. журн. / Организация Объединенных Наций по вопросам образования, науки и культуры.– 1996. – № 187. – 50 с.

4. *Почобут, Н. А.* Сохранение и изучение археологического наследия в музеях БССР (1944–1991) / Н. А. Почобут. – Гродно : ЮрСаПринт, 2019. – 194 с.

5. Устав Минского городского музея. – Минск : Электротип. И. Каплан, 1913. – 2 с.

6. Our Greatest Artefact: the City. Essays on cities and museums about them [Electronic resource]. – 2012. – Mode of access: http://camoc.mini.icom.museum/wp-content/uploads/sites/4/2018/12/CAMOCBookOurGreatestArtefactTheCity.pdf. – Date of access: 03.04.2021.


# ПАТРИОТИЗМ В СИСТЕМЕ СОВРЕМЕННЫХ ЦЕННОСТЕЙ


***А. О. Кислач,*** *студент*
*Белорусского государственного университета культуры и искусств;*
***Т. И. Песецкая,***
*кандидат физико-математических наук,*
*доцент кафедры информационных систем в культуре*
*Белорусского государственного университета культуры и искусств*


В условиях глобализации и политических изменений «рельеф» культурных ценностных паттернов той или иной нации, народа, населения региона, страны претерпевает большие изменения. Геополитические и социально-экономические процессы оказывают существенное влияние на трансформацию моральных ценностей общества [3]. Перед институтами образования сегодня стоят вызовы формирования гражданственности и патриотизма в противоречивых условиях ценностных ориентиров, складывающихся в многообразии ценностных доминант различных культур, транслируемых в информационном пространстве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ